УДК 62:001.1+940.5

*І. В. Варывончык*

# Першы этап НТР і фарміраванне грамадства "ўсеагульнага дабрабыту" ў краінах Захаду ў 50—60-я гады

У гісторыі краін Заходняй Еўропы і Паўночнай Амерыкі 50—60-я гады займаюць асобае месца і ўяўляюць сабой незвычайны кантраст з даваеннымі. 1-я палова XX ст. у гэтых краінах — перыяд глыбокіх сацыяльных і палітычных супярэчнасцей, эканамічнай нестабільнасці, вяршыняй якой з'явіўся крызіс 1929—1932 гг., дзвюх сусветных войн, што ўвасобілі ў сабе канфліктнасць грамадства, эканамічнага і сацыяльнага развіцця. 2-я палова — перыяд хуткага эканамічнага росту, рашэння складаных сацыяльна-эканамічных праблем, якія вякамі стаялі перад людзьмі, адноснай палітычнай стабільнасці, мірнага вырашэння канфліктных сітуацый праз інстытуты і працэдуры, што эфектыўна дзейнічалі ў рамках парламенцкай дэмакратыі.

Што ж ляжала ў аснове рашучых, па сваёй існасці рэвалюцыйных змен у жыцці людзей і грамадства? Важнейшай асаблівасцю, вызначальнай рысай развіцця заходніх грамадстваў пасля 2-й сусветнай вайны стала навукова-тэхнічная рэвалюцыя. Менавіта яна прынесла ва ўсе сферы жыцця тыя якасныя змены, якія даюць падставу гаварыць аб адыходзе цэлай гістарычнай эпохі і замацаванні новай: эпохі НТР у гісторыі заходняй цывілізацыі.

Пачатак НТР быў падрыхтаваны папярэднім развіццём навукі і такімі вынаходніцтвамі XX ст., як тэорыя адноснасці, квантавая фізіка, тэорыя элементарных часціц, кібернетыка, мікрабіялогія, палімерная хімія і інш. Навука на этапе НТР становіцца самастойнай вытворчай сілай і часткай вытворчасці. Капіталаўкладанні ў яе раслі пасля 2-й сусветнай вайны ў 2-2,5 разы хутчэй, чым капіталаўкладанні ў цэлым. Адбываецца прамая інтэграцыя навукі і вытворчасці праз цеснае супрацоўніцтва ВНУ і прадпрыемстваў. Час асваення і ўкаранення ў жыццё дасягненняў навукі скараціўся з 30 гадоў у пачатку стагоддзя да 5-7 у 60-я гады. Так, калі ад моманту вынаходніцтва тэлефона і радыё да іх шырокай вытворчасці і выкарыстання прайшло адпаведна 56 і 35 гадоў, то асваенне тэлебачання заняло ўжо 12 гадоў, а ўкараненне транзістара — толькі 3 гады.

Найбольш глыбокія змены адбыліся ў тэхніцы і тэхналогіі. Узніклі новыя сродкі вытворчасці: аўтаматызаваныя сістэмы, прамысловыя робаты, станкі з праграмным забеспячэннем, што павысіла прадукцыйнасць працы. Рэзка ўзрасло выкарыстанне нафты і газу,

з'явіліся АЭС, што стварала магчымасці росту вытворчасці. Пашыралася сыравінная база вытворчасці галоўным чынам за кошт хімізацыі і ўкаранення пластмас. Доля хімічнага валакна ў тэкстыльнай вытворчасці ўзрасла, напрыклад, з 10% у 40-я гады да 50% у 60-я. Рэвалюцыйныя змены адбыліся ў сельскай гаспадарцы. Яе механізацыя, электрыфікацыя, хімізацыя, шырокае выкарыстанне селекцыі прывялі да скарачэння затрат жывой працы, што зрабіла магчымым 2-10% рабочай сілы, занятай у сельскай гаспадарцы, забяспечыць вытворчасць дастатку прадуктаў харчавання. Вынаходніцтвы і ўкараненне ЭВМ прывялі да росту вытворчасці працы і пашырылі магчымасці кантролю і планавання вытворчасці. Комплекс гэтых змен азначаў паступовы пераход ад экстэнсіўнага да інтэнсіўнага тыпу эканамічнага росту, г. зн. за кошт выкарыстання дасягненняў НТР, павелічэння долі разумовай і складанай працы, удасканалення арганізацыі і кіравання.

Не менш сур'ёзныя змены адбыліся ў структуры эканомікі. Рост прадукцыйнасці працы, пашырэнне сферы кіравання, інфармацыйнага забеспячэння і адукацыі прывялі да росту нематэрыяльнай сферы вытворчасці. Да 70-х гадоў у ёй было занята 35-40% рабочай сілы, а ў ЗША, Канадзе, Вялікабрытаніі, Бельгіі, Швецыі, Нідэрландах — больш за 50%. У агульным аб'ёме вытворчасці паменшылася роля здабываючай і лёгкай прамысловасці, узрасла доля машынабудавання, хімічнай і электратэхнічнай галін.

Важнейшай рысай развіцця ў 50-60-я гады была канцэнтрацыя вытворчасці за кошт павелічэння памераў прадпрыемстваў, зліцця фірм, росту ролі буйнейшых манаполій. Так, толькі адна амерыканская кампанія IBM вырабляла ў гэты час 70-75% камп'ютэраў у свеце. Узніклі вялікія транснацыянальныя карпарацыі. Дробны і сярэдні бізнес быў адціснуты і ўсё больш трапляў у залежнасць ад буйных манаполій, дамінуючых на таварным рынку.

Другім працэсам, цесна звязаным з НТР, стала ўзмацненне ролі дзяржавы ў жыцці краін Захаду, стварэнне кейнсіянскай мадэлі сацыяльна-эканамічнага рэгулявання і грамадства "ўсеагульнага дабрабыту" ў 50-60-я гады. Неабходнасць развіцця НТР патрабавала значна большага, чым раней, удзелу дзяржавы ў арганізацыі вытворчасці і спажывання, таму што рост вытворчых сіл аказаўся б немагчымы без забеспячэння значна большай планамернасці і прапарцыянальнасці іх развіцця.

З другога боку, на рашаючых напрамках НТР патрабавалася мабілізацыя фінансавых, матэрыяльных, чалавечых рэсурсаў у маштабах усёй краіны. Вопыт паказаў, напрыклад, што арганізацыйным цэнтрам у асваенні ЭВМ, стварэнні рэактыўнай авіяцыі, АЭС, касмічных праграм і да т. п. навукаёмкіх праектаў нязменна выступала дзяржава. Яна ж павінна была паклапаціцца аб арганізацыі адпаведнай патрабаванням НТР сістэмы адукацыі і падрыхтоўкі кадраў. Звязанае з НТР паскарэнне тэмпаў эканамічнага развіцця вяло да росту міжнароднай канкурэнцыі і рабіла неабходным узмацненне ролі дзяржавы ў знешне-эканамічнай дзейнасці. Адзначаны рост буйных

манаполій патрабаваў рэгулявання канкурэнтнай барацьбы, што выявілася ў прыняцці адпаведных антыманапольных законаў. Рост ролі дзяржавы быў выкліканы таксама павелічэннем долі ў эканоміцы краін Захаду ваенна-прамысловага комплексу, які выкарыстоўваў у сваіх мэтах навейшыя дасягненні навукі і тэхнікі. Нарэшце, зусім новую ролю павінна была адыграць дзяржава ў справе стварэння неабходных сацыяльных амартызатараў грамадства, якое бурна развівалася.

Працэс узмацнення пазіцый дзяржавы пачаў адбывацца ў канцы 40-х — пачатку 50-х гадоў, чаму спрыялі сацыяльна-палітычныя ўмовы. Па-першае, гэтаму садзейнічаў вопыт дзяржаўнага рэгулявання, які існаваў напярэдадні і ў гады вайны. Класічным яго прыкладам быў "новы курс" Ф. Рузвельта ў ЗША, які дазволіў вывесці краіну з найглыбейшага ў яе гісторыі крызісу. Дзякуючы цвёрдаму дзяржаўнаму рэгуляванню ў перыяд вайны многія англійскія працаўнікі не толькі не сталі жыць горш, але нават палепшылі сваё матэрыяльнае становішча. У 1921—1938 гг. беспрацоўе ў Вялікабрытаніі складала ў сярэднім 14%, дасягаючы ў асобныя гады 22%. У ЗША ў 1933 г. яно перавышала 25%, а ў 1938 г. склала 19%. Ва ўсякім выпадку пасля вайны ніхто не хацеў звароту да часоў дэпрэсіі, масавага беспрацоўя. крызісу 20—30-х гадоў.

Па-другое, пачынаючы з даваеннага часу, Захад з вялікай зацікаўленасцю назіраў за эксперыментамі дзяржаўнага рэгулявання ў Савецкім Саюзе. Прыхільнікаў паўтарэння гэтага вопыту ў поўным аб'ёме было параўнальна нямнога, але выкарыстанне элементаў планавай эканомікі, узмацненне з дапамогай дзяржавы сацыяльнай палітыкі ўяўлялася магчымым і неабходным. І не толькі радыкальна настроеным прыхільнікам прасацыялістычнай арыентацыі ў Францыі або Італіі. Вопыт мінулага, патрабаванні рэканверсіі і аднаўлення эканомікі пасля вайны пераканалі прагматычна настроеныя дзелавыя колы ў мэтазгоднасці ўзмацнення дзяржавы як гаранта стабільнасці, эфектыўнага эканамічнага рэгулятара, стваральніка неабходных сацыяльных амартызатараў далейшага развіцця.

З 50-х гадоў пануючай мадэллю сацыяльна-эканамічнага рэгулявання ў заходніх краінах становіцца кейнсіянства. Ідэі англійскага эканаміста Джона Мейнарда Кейнса (1886-1946) былі шырока вядомыя ўжо з 30-х гадоў і ўяўлялі сабой цэласную сістэму макраэканамічных мер антыкрызіснага характару. У больш шырокім сэнсе дзяржаўнае рэгуляванне па Кейнсу разумелася як "ліберальны сацыялізм", як адзіны шлях захавання ідэалаў асабістай свабоды, прыватнай уласнасці і ліберальнай дэмакратыі ад пагрозы спаўзання да фашызму ці камунізму, як сярэдзінны шлях, што ўключае ў сябе перавагі савецкай планавай эканомікі і свабоднай рыначнай гаспадаркі.

Кейнсіянская "агульная тэорыя занятасці, працэнта і грошай" дапускала: 1) антыцыклічную палітыку, заснаваную на маніпуляванні супольным попытам з дапамогай бюджэту, налогаў і крэдытаў; 2) поўную занятасць, пераразмеркаванне нацыянальнага даходу праз

бюджэтную сістэму ў бок павелічэння долі наёмных работнікаў. І тое, і іншае канкрэтна рэалізоўвалася, па-першае, праз вялізны дзяржаўны сектар, бюджэтныя метады стымулявання попыту, падтрымку канкурэнтаздольнасці стратных прадпрыемстваў, стварэнне шляхам планавання агульных спрыяльных умоў для высокіх тэмпаў эканамічнага развіцця, па-другое, з дапамогай арганізацыі грамадства "усеагульнага дабрабыту" — пераразмеркавання даходаў з дапамогай налогавай палітыкі, павышэння долі наёмнай працы ў ВНП за кошт росту заработнай платы, апераджальнага росту прыбыткаў, скарачэння долі прыватнай маёмасці і росту ролі грамадскай маёмасці і грамадскіх фондаў спажывання.

У канцы 40-х — 50-я гады былі разгорнуты дзяржаўныя службы па кантролю і кіраванню эканамічнай дзейнасцю. У большасці краін склаўся шырокі сектар нацыяналізаваных галін. Метады налогавага і крэдытна-грашовага стымулявання забяспечылі хуткія тэмпы рэканверсіі і ўстойлівае эканамічнае развіццё. Высокі попыт на спажывецкія тавары і інвестыцыі, які ўзнік пасля вайны, у спалучэнні з укараненнем навейшых тэхналогій забяспечылі практычна бяскрызіснае развіццё на працягу 15-20 гадоў.

Падкрэслім, што стварэнне і паспяховае функцыянаванне кейнсіянскай мадэлі рэгулявання было цесна звязана з НТР. Менавіта НТР забяспечыла небывалы рост прадукцыйнасці працы і высокія тэмпы эканамічнага росту. У сярэднім у заходніх краінах яны складалі 5,8% у год (у ФРГ — 9%, Італіі — 7,8%, Японіі — 15,2% і г. д.). Да вайны гэты паказчык складаў 3,9%. Высокія тэмпы эканамічнага росту ў сваю чаргу дазвалялі пераразмеркаваць частку рэсурсаў у сферу сацыяльных паслуг. Прадпрымальнікі, якія з такімі цяжкасцямі ішлі на ўступкі патрабаванням аб росце сацыяльных трат да вайны, атрымалі магчымасць бясклопатна аддаваць частку прыбытку наёмным работнікам, разглядаючы гэта як пэўныя гарантыі паспяховага развіцця ў будучым.

Палітычным эквівалентам працэсаў пераразмеркавання прыбыткаў ва ўмовах устойлівага эканамічнага росту быў працэс зближэння пазіцый розных партый у пытанні аб шляхах далейшага развіцця. Сацыял-дэмакратычныя партыі паступова адмаўляліся ад планаў усеагульнай нацыяналізацыі, правыя, кансерватыўныя партыі, прызнавалі, што дзяржаўнае рэгуляванне можа быць дзейсным сродкам забеспячэння эфектыўнасці вытворчасці. У рамках існуючага кансэнсусу адрозненні ў праграмах сталі зводзіцца да выбару спосабаў рэалізацыі адной і той жа кейнсіянскай мадэлі.

Ажыццяўленне кейнсіянскай мадэлі рэгулявання мела перспектыву. У 50-60-я гады адбыўся пераход ад нізкай зарплаты і высокай ступені эксплуатацыі да супрацьлеглага. Рэальная заработная плата ў ЗША вырасла ў 8 разоў, у Вялікабрытаніі, Францыі ў 3-4 разы. Доля аплаты наёмнай працы ў нацыянальным даходзе ўзрасла ў параўнанні з даваенным перыядам з 30-35% да 65-70%, што можа разглядацца як працэс пераадолення эксплуатацыі. Былі развіты прынцыпы сацыяльнага страхавання, закладзеныя ў канцы XIX-пачатку

XX ст., прыняты законы аб ахове працы, дапамозе бедным, стварэнні нацыянальных сістэм аховы здароўя, удасканаленні сістэм адукацыі. У 60-я гады большасць сем'яў ужо мелі стандартны бюджэт, які дазваляў аплачваць сучаснае жыллё, аўтамабіль, тавары даўгачаснага карыстання, затраты на адпачынак, адукацыю дзяцей. Было ліквідавана палажэнне, пры якім голад, беднасць, невуцтва, хваробы былі характэрнымі для большасці насельніцтва. Такім чынам, было зроблена нямала не толькі для рэалізацыі базавага прынцыпу заходняга грамадства — роўнасці магчымасцей, але і прынцыпу роўнасці вынікаў.

Безумоўна, усе поспехі ў паляпшэнні становішча наёмнага работніка дасягаліся ў працэсе вострых сутыкненняў прафсаюзаў, палітычных партый, грамадскіх арганізацый з прадпрымальнікамі, манаполіямі і дзяржавай. Вастрыня іх узаемаадносін яшчэ захоўвалася, але большая частка канфліктаў вырашалася ў рамках законных працэдур, пры пасрэдніцтве дзяржавы. Шырокае распаўсюджванне атрымаў саўдзел наёмных работнікаў і прадпрымальнікаў у кіраванні вытворчасцю і размеркаванні. Працуючыя па найму сталі асноўнымі налогаплацельшчыкамі, атрымалі магчымасць уздзейнічаць на сацыяльна-палітычную і эканамічную сітуацыю праз прафсаюзы, якія прадстаўлялі іх інтарэсы, і партыі, што час ад часу прыходзілі да ўлады.

Такім чынам, выкарыстанне вынікаў першага этапа НТР у спалучэнні з кейнсіянскай мадэллю дзяржаўнага рэгулявання вывела краіны Захаду на якасна новы ўзровень сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця. Але ўжо ў 70-я гады наладжаны механізм пачынае даваць збой. Узнікае энергетычны крызіс, інфляцыя і масавае беспрацоўе, замаруджваюцца тэмпы эканамічнага росту. Дастаткова хутка выявілася неадпаведнасць кейнсіянства, дактрыны грамадства "ўсеагульнага дабрабыту" новым сацыяльна-эканамічным рэаліям, народжаным другім этапам НТР.


## *SUMMARY*

The article contains the analysis of the influence of the scientific and technical revolution on the process of creation of the "wellfare state" in western countries in 1950th and 1960th. It also brings to light the economical, political and social consequences of that process.